УДК 947

*А.Ф. Вашкевіч*

# БЕЛАРУСКАЯ ХРЫСЦІЯНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ (1921–1939 г.): ДА ПЫТАННЯ АБ ФІНАНСАВАННІ ПАРТЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

У артыкуле разглядаецца пытанне аб крыніцах фінансавання адной з найбольш уплывовых беларускіх палітычных партый міжваеннага часу – Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Наяўныя даследаванні беларускіх і замежных даследчыкаў, а таксама неапублікаваныя дакументы дазваляюць зрабіць выснову, што БХД фінансавалася асноўным чынам за кошт беларускіх каталіцкіх ксяндзоў і беларускіх паслоў Сейма Польшчы – прыхільнікаў хрысціянскіх дэмакратаў. Значную, аднак не вырашальную, ролю ў функцыянаванні партыі адыгрывалі таксама і знешнія фінансавыя плыні з боку Літвы, Савецкай Беларусі і ўкраінскіх нацыянальных дзеячаў.

## Уводзіны

Пытанне аб фінансаванні дзейнасці палітычных партый, што ў розныя часы функцыянавалі на тэрыторыі Беларусі, да сённяшняга дня не атрымала належнай увагі з боку айчынных гісторыкаў. Такое становішча трэба прызнаць нездавальняючым, паколькі менавіта крыніцы фінансавання ў вельмі значнай ступені абумоўлівалі як ідэалогію гэтых палітычных партый, так і іх канкрэтную практычную дзейнасць. Савецкія беларускія гісторыкі, прысвячаючы найбольш увагі гісторыі КП(б)Б, пісалі аб палітычных партыях нацыянальнай скіраванасці выключна адмоўна, нават у пасляваенны час паўтараючы газетныя штампы, што паходзілі яшчэ з 1930-х гг. Гэта тычыцца і адной з найбольш значных беларускіх партый міжваеннага перыяду – Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

Такім чынам, пачынаючы разгляд пытання, у якасці галоўнай праблемы мы вызначаем неабходнасць вывучэння галоўных крыніц фінансавання БХД, паколькі лічым гэтае пытанне недастаткова асветленым у гістарыяграфіі і адначасова вельмі важным для вывучэння фарміравання партыйных структур БХД, яе ідэалогіі і сацыяльнай базы.

Імкненне як мага больш поўна даследаваць унутраныя і знешнія крыніцы фінансавання БХД, высветліць ступень іх значнасці для партыі на розных этапах яе існавання запатрабавала шырокага выкарыстання гісторыка-параўнальнага і гісторыка-генетычнага метадаў гістарычнага аналізу, а таксама элементаў структурнага аналізу праблемы. Выкарыстанне гэтых метадаў дазволіла дастаткова поўна асвятліць пытанне фінансавання БХД на працягу яе існавання.

## Асвятленне пытання фінансавання партыйнай дзейнасці БХД у гістарычнай навуцы 1930–1990-х гг.

Прапагандысцка-ідэалагічная ўстаноўка аб шырокіх сувязях лідэраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі з польскай адміністрацыяй, разведкай і, адпаведна, згодніцкім характары самой партыі склалася ў канцы 1920-х – 1930-х гг. Менавіта БХД на працягу 1930-х гг. была, напэўна адзінай беларускай партыяй, якая прапагандавала ў якасці галоўнага пастулата дасягненне поўнай незалежнасці Беларусі і адначасова мела

---

Навуковы кіраўнік – У.І. Навіцкі, доктар гістарычных навук, прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі

даволі шмат прыхільнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Безумоўна, кампраметацыя БХД, як незалежніцкай партыі, у гэты час стала прынцыповай задачай савецкіх спецслужбаў і ідэалагічных структураў Савецкай Беларусі.

Ці не найбольшае значэнне ў гэтых абвінавачваннях мелі сцверджанні аб фінансаванні залежнасці БХД ад польскіх дзяржаўных органаў. Напрыклад, аўтары надрукаванай у 1935 годзе Акадэміяй навук БССР працы «Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине», прызнаючы пэўныя ўплывы БХД сярод насельніцтва Заходняй Беларусі, падкрэслівалі факт цеснага супрацоўніцтва беларускіх хадэкаў і польскай адміністрацыі на Крэсах: «польское фашистское правительство предпочитает поддерживать БХД, которая имеет в массах большее влияние, чем какая-либо другая политическая организация белорусской буржуазии» [5, с. 289].

У 1934 г. на тэрыторыі БССР была надрукавана брашура Алеся Гарадоцкага пад назвай “Як Беларуская Хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і сялян” [2, 1934, № 29. с. 2]. Напісана была яна на аснове паказанняў вывезенага савецкімі спецслужбамі ў Мінск з Усходняй Прусіі былога функцыянера БХД Паўла Карузы. У брашуры хадэкі і дзеячы Беларускага сялянскага саюза (у прыватнасці кс. Ад. Станкевіч і Ф. Ярэміч) абвінавачваліся ў сувязях з кіраўніком віленскай дыфензівы Кіртыклісам (напрыклад, што атрымалі ад яго 74 тыс. злотых на правядзенне выбарчай кампаніі 1928 г.) [5, с. 274–275]. Праз многа гадоў П. Каруза прызнаваў, што даведзены да знямогі бяссонніцай (яму не давалі спаць) напісаў гэтыя “паказанні” пад дыктоўку мінскага следчага Оберфельда.

Яшчэ праз тры гады з’явілася інфармацыя аб агромністай суме, якую польская разведка прапаноўвала беларусам і да атрымання якой з беларускага боку меў дачыненне кс. Ад. Станкевіч – 15 мільёнаў даляраў. Такую суму назваў у сваіх паказаннях В.Ластоўскі. Ён засведчыў, што яшчэ ў сярэдзіне 1920-х гг. сустракаўся са сваяком Юзэфа Пілсудскага Заянчкоўскім і той прапанаваў Ластоўскаму стварыць невялікі камітэт з 3–5 чалавек, які мог бы распараджацца гэтымі грашыма для арганізацыі беларускага антысавецкага руху. Ластоўскі ўключыў у гэты камітэт, апроч сябе, К. Душэўскага і кс. Ад. Станкевіча, які быў спецыяльна выкліканы з Вільні ў Коўна [7, № 9. с. 234–235]. Паказанні гэтыя, што, несумненна, таксама пісаліся пад дыктоўку следчага, хутчэй за ўсё павінны былі быць выкарыстаны для кампраметацыі Душэўскага і Станкевіча, якія ў канцы 1930-х гадоў актыўна дзейнічалі за межамі СССР і былі недасягальныя для НКУС.

Прыведзеныя вышэй факты ніколі не паўтараліся нават савецкімі беларускімі гісторыкамі ў пасляваенныя гады, сёння ж іх можна абвергнуць дакументальна. У матэрыялах дыфензівы лідэры беларускай хадэцыі праходзяць як перакананыя прыхільнікі незалежнасці Беларусі. Што ж тычыцца агромністых сумаў, якія дыфензіва быццам бы перадавала БХД на арганізацыю выбараў, то, паводле матэрыялаў самой дыфензівы, БХД прыступала да выбараў, “маючы абсалютна пустую партыйную касу [9, Sygn. I.303.4.2706. K. 20]”. Дзяржаўныя структуры Польшчы на працягу 1921–39 гг. ніколі не фінансавалі не тое што палітычнай, але нават культурнай і асветніцкай дзейнасці БХД. Тое самае тычыцца і дапамогі з боку касцёла. За перыяд 1926–1939 гг. біскупская курыя аказала беларускім хадэкам дапамогу ў выданні толькі адной кніжкі – “Кароткага катэхізма для беларусаў-каталікоў” ксяндза Язэпа Рэшаця [10, с. LIII].

Сучасныя беларускія гісторыкі выказалі некалькі версіяў аб магчымых крыніцах фінансавання БХД, не прысвячаючы, аднак, гэтаму пытанню асобных даследаванняў. Так, даследчык Юрый Туронак выказаў меркаванне аб тым, што на працягу 1920–30-х гг. асноўнай крыніцай грашовых паступленняў для партыі былі даходы ад гаспадаркі манастыра ордэна марыянаў у мястэчку Друя, створанага ў 1923 годзе пры падтрымцы тагачаснага віленскага арцыбіскупа Ю. Матулевіча і княгіні М. Радзівіл [8, с. 397].

Гэты тэзіс паўтараецца ў адным з артыкулаў гродзенскага гісторыка І. Коўкеля. Апошні таксама піша аб тым, што кіраўнікі БХД падтрымлівалі тэрытарыяльныя прэтэнзіі Літвы на землі Віленшчыны і Гродзеншчыны, за што атрымлівалі ад яе матэрыяльную дапамогу [4, с. 40].

**Асноўныя крыніцы фінансавання дзейнасці БХД (1921–1939 гг.)**

Праведзены аўтарам аналіз літаратуры і крыніц, у якіх асвятляецца праблематыка, звязаная з фінансаваннем дзейнасці БХД, дазваляе прыйсці да высновы, што абсалютызаваць фінансавыя магчымасці кляштара ў Друі не варта. Па-першае, далёка не ўсе ахвяраваныя М. Радзівіл сродкі сапраўды пайшлі на беларускую справу. Напрыклад, грошы, атрыманыя за брыльянтавае кальe, падараванае беларускім святарам Магдаленай Радзівіл, кс. Ф. Абрантовіч часткова пазычыў біскупу З. Лазінскаму на будаўніцтва ў Пінску духоўнай семінарыі, а на рэшту купіў два дамы ў Навагрудку. Па-другое, на працягу 1930-х гг. суперыёр друйскага манастыра А. Цікота меў даволі напружаныя стасункі з тагачаснымі ідэолагамі БХД (у прыватнасці кс. Ад. Станкевічам), якіх вінаваціў у палітыканстве, і стараўся неяк адмежаваць сваіх гадаванцаў (напрыклад, вучняў марыянскага дома ў Вільні) ад уплываў хадэкаў. Па-трэцяе, і друйскі кляштар часцей за ўсё сам знаходзіўся не ў найлепшым фінансавым становішчы. У 1935 г. ксёндз Язэп Германовіч, які ў гэты час быў у Харбіне, атрымаў у спадчыну дом у Пружанах. Ксёндз прадаў дом нейкаму Ройку, а атрыманыя 2300 даляраў перадаў кс.Ад. Станкевічу. Кс. Германовіч наказваў Станкевічу пакінуць з гэтай сумы 1500 даляраў на выдавецтва “Беларускай Крыніцы” і “Хрысціянскай Думкі”, а 800 перадаць у Друю, “бо і там бяда” [3, арк. 15]. Як бачым, беларускім ксяндзам самім даводзілася дапамагаць Друі.

Меркаванне аб падтрымцы БХД з боку Літвы пацвярджаецца фактамі, але патрабуе ўдакладнення. Безумоўна, на працягу ўсяго міжваеннага дваццацігоддзя лідэры БХД бачылі ў Літоўскай рэспубліцы найбольш рэальнага саюзніка ў барацьбе за незалежнасць Беларусі, тым больш што да пачатку 1927 г. у Коўне актыўна працаваў В. Ластоўскі, які, па ўсёй бачнасці, лічыў сваёй найбольш даверанай асобай у Заходняй Беларусі менавіта ксяндза Адама Станкевіча. Гэтага ксяндза польская паліцыя характарызавала як “старога калегу і супрацоўніка Ластоўскага” [9, Sygn. I.303.4.2475]. Гэта не дзіўна, бо, па некаторых звестках, кс. Ад. Станкевіч займаў ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі, створаным у канцы 1919 г. В. Ластоўскім, пасаду міністра рэлігійных справаў.

Найбольш верагодна, што літоўскія грошы траплялі да лідэраў БХД трыма асноўнымі шляхамі:

1. Па лініі Ураду БНР – праз В. Ластоўскага, які да свайго ад’езду ў Мінск у пачатку 1927 г. перадаваў дзеячам Беларускага пасольскага клуба (БПК) ў польскім Сейме пэўныя грашовыя сумы.
2. Праз літоўскія нацыянальныя арганізацыі ў Вільні для пакрыцця дэфіцытаў беларускай прэсы (у прыватнасці органа БХД “Крыніца”). Да гэтых захадаў меў дачыненне Беларускі нацыянальны цэнтр у Літве пад кіраўніцтвам В. Ластоўскага.
3. Непасрэдна ад літоўскіх нацыянальных дзеячаў і арганізацыяў Віленшчыны беларускім хрысціянскім дэмакратам.

Аднак у 1922 – першай палове 1925 гг. фінансавая сродкі літоўцы прызначалі на патрэбы ўсяго, яшчэ адзінага, беларускага руху. Грошы ішлі не непасрэдна ў касу БХД, а найперш для БПК, намеснікам якога быў адзін з лідэраў беларускіх хадэкаў кс. Ад. Станкевіч. Больш таго, як сведчыў В. Ластоўскі, «полностью литовцы не финансировали белорусской виленской прессы – издания Станкевича и Яремича, но только частично покрывали их дефицит. На совещаниях в Данциге обыкновенно стоял

вопрос средств на прессу. Результат совещания я докладывал на заседании Центра. Средства литовцы передавали, кажется, через свой комитет в Вильно» [7, № 8, с. 233]. Вельмі падобныя звесткі знаходзім і ў польскіх афіцыйных матэрыялах аб беларускім руху (люты 1923 г.): "Сродкі віленскай экспазітуры сеймавага клуба фарміруюцца з адлічэння 10% ад пасольскіх дыетаў, з даходаў Беларускага нацыянальнага камітэта і з-за мяжы (Ластоўскі). З гэтых сродкаў выдаюцца дзве газеты – "Крыніца" і "Новае жыцьцё" [9, Sygn. I.303.4.5230. K. 60]."

Як бачым, на аснове вядомых сёння фактаў можна сцвердзіць, што падтрымка БХД з боку літоўскай рэспублікі была хутчэй спарадычнай, чым пастаяннай. Нельга таксама забывацца і пра тое, што пачынаючы з 1923 года, калі Ліга Нацый прызнала Віленшчыну часткай Польшчы, увага літоўскіх правячых эліт да беларускага пытання значна зменшылася.

Такім чынам, грашовыя паступленні для беларускіх хадэкаў з Літвы і ад манахаў з Друі хаця і мелі месца, аднак не адыгрывалі вырашальнай ролі ў фарміраванні партыйнага бюджэту. Перш чым перайсці да разгляду звестак аб іншых крыніцах фінансавання БХД, звернем увагу на асноўныя артыкулы расходаў гэтай партыі.

БХД, у адрозненне, скажам, ад КПЗБ, не мела штату нелегальных платных функцыянераў. Большасць партыйных пасад, за выключэннем справавода, таксама пастаянна не аплачвалася. Па гэтай прычыне расходы на партыйную бюракратыю былі невялікія і абмяжоўваліся аплатай справавода і камандзіровачных выдаткаў. Амаль усе фінансы партыі ішлі на прапаганду. Галоўным накірункам тут была, несумненна, выдавецкая справа.

Друкаванае слова было адным з галоўных сродкаў палітызацыі беларускіх мас. Партыйныя газеты, адозвы, лістоўкі, папулярная і адукацыйная літаратура на беларускай мове выдатна дапамагалі культурнай рабоце і пашырэнню нацыянальнай ідэі, але, з другога боку, патрабавалі вялікіх грашовых укладанняў, якіх беларускі рух ніколі не меў. Апроч чыста фінансавых праблем, вельмі актуальным было і пытанне аб адсутнасці ў беларусаў у Польшчы сваёй друкарні. Менавіта таму стварэнне Беларускай друкарні імя Францішка Скарыны трэба прызнаць найбольш удалай у фінансавым сэнсе акцыяй дзеячаў, звязаных з Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй. Ідэя стварэння друкарні, па ўсёй бачнасці, належыць Янку Станкевічу, аднак справай набыцця друкарні заняліся тры чалавекі: ксёндз Адам Станкевіч, Фабіян Ярэміч і суперыёр марыянскага кляштара ў Друі ксёндз Андрэй Цікота. Па звестках Я. Найдзюка, фінансавы ўклад Цікоты быў самы значны, хаця, безумоўна, паслы Сейма кс. Ад. Станкевіч і Ф. Ярэміч таксама ахвяравалі частку сваіх пасольскіх грошай [8, с. 397]. Магчыма, некаторыя сродкі былі атрыманыя і ад В. Ластоўскага. Ужо ў маі 1926 г. кс. Ад. Станкевіч і Ф. Ярэміч купілі частку друкарні „Lux" у Вільні і заснавалі Беларускую друкарню імя Ф. Скарыны.

Нягледзячы на тое, што валоданне друкарняй амаль не прыносіла прыбыткаў, яно дазволіла значна скараціць расходы на друкаванне літаратуры, газет і часопісаў, зрабіла выдавецтва больш самастойным і адносна бяспечным. Друкарня праіснавала да 1940 г. і адыграла важную ролю ў беларускім жыцці: толькі кнігаў за 15 гадоў было надрукавана не менш 146 (каля 40% ад агульнай колькасці ўсіх легальных беларускіх кніжак у міжваеннай Польшчы), выдавалася ўся хадэцкая перыёдыка. Друкаваліся партыйныя адозвы, бланкі дакументаў, абвесткі, а таксама значная частка выданняў іншых палітычных груповак. Надрукаваныя кнігі па падпісцы рассылаліся гурткам БІГіКа і рэалізоўваліся праз кнігарні. Кнігі з друкарні карысталіся пэўнай папулярнасцю, пра што сведчыць выданне заходнебеларускімі камуністамі сваіх кніг і брашур з прастаўленым на іх аўтарствам кс. Ад. Станкевіча або Беларускай друкарняй

імя Ф. Скарыны як месцам выдання [2, 1930, № 25, с. 2]. Папулярнасць і аўтарытэт лідэраў БХД дазвалялі ім збіраць грошы на кнігі сярод беларускіх грамадзян, найперш інтэлігенцыі. Напрыклад, ахвяраванні на адзін беларускі малітоўнік збіраліся адразу на асабісты рахунак кс. Ад. Станкевіча ў банку, а газета “Крыніца” ўжо ў сярэдзіне 1920-х гг. мела амаль 900 падпісчыкаў па ўсёй Беларусі [2, 1925, № 5, с. 1–2]. Але фінансавыя праблемы і надалей патрабавалі пошуку магчымасцей для выдання больш танных беларускіх кніг. Кс. Германовіч аднойчы нават прапанаваў кс. Станкевічу выдаваць беларускія кніжкі ў кітайскім Харбіне [3, арк. 18].

Адной з важнейшых крыніцаў фінансавання БХД і залежных ад яе структураў былі заробкі беларускіх паслоў польскага Сейма. Заробак пасла (гэтак званыя “пасольскія дыеты”) складаў да 600 $. Частка гэтых грошай ішла ў касу БПК, частка ў партыйную касу. У перыяд 1925–1927 гг. БХД у Сейме прадстаўляў кс. Ад. Станкевіч, пасля выбараў 1928 года дзейнасць партыі фінансавалі паслы Сейма ад БХД А. Стэповіч і П. Каруза. Аб тым, наколькі залежалі беларускія хадэкі ад пасолькіх грошай сваіх дэпутатаў у Сейм, сведчаць гадавыя справаздачы Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Калі ў 1929 г. БІГіК амаль штомесяц атрымліваў ад Беларускага пасольскага клуба 600 злотых (з іх 200 зл. атрымліваў справавод, 120 зл. – настаўніцы школ у Шаўлянах і Рудаўцы), то ў 1931 г., калі БПК ужо не існавала, урад БІГіКа за цэлы год патраціў усяго 1620 зл. і меў у выніку больш 300 зл. дэфіцыту [6, спр. 4, арк. 4–7]. У 1935 годзе гадавы абарот урада БІГіКа склаў усяго 975 зл. 35 гр. [6, спр. 4, арк. 11 адв]. Няцяжка падлічыць, што фінансавыя паступленні ў 1931 годзе знізіліся адносна 1929 г. як мінімум у тры–чатыры разы, а ў 1935 г. у шэсць разоў.

У такой сітуацыі не магло нават быць размовы аб значнай грашовай дапамозе партыйным арганізацыям па-за Вільняй. Мясцовыя гурткі і БХД, і БІГіКа павінны былі забяспечваць самі сябе. У 1931 г. кс. В. Гадлеўскі пісаў да членаў аднаго з гурткоў БІГіКа: “Даўней было 4 паслы і 2 сенатары, тады яны складаліся на Інстытут, а цяпер і гэтага няма, дык Інстытут пакінуты самому сабе і ахвярнасьці прыватных людзей, якія таксама бедны. Цяпер Інстытут трымаецца таго правіла, што кожны гурток павінен быць самавыстарчальным, г.зн. сам павінен здабываць спосабы для свайго існаваньня. Гэткімі спосабамі служаць тэатральныя пастаноўкі, але што ж? І да іх часам трэба дакладаць. Але ці гэта мае значыць, што мы павінны кінуць усю культурную працу і чакаць толькі помачы? Не, ніхто нам не паможа, калі мы самі сабе не паможам” [6, спр. 10, арк. 275адв]. Фактычна з-за адсутнасці сродкаў і рэпрэсій польскай адміністрацыі прыйшлося зачыніць прыватныя школы ў Рудаўцы і Шаўлянах, што ўтрымліваліся хадэкамі. У ліпені 1931 г. кс. Гадлеўскаму прыйшлося поўнасцю выкласці ўсю касу інстытута, каб хоць часткова выдаць настаўніцам заробкі [6, спр. 10, арк. 10].

Не менш значнай крыніцай фінансавання беларускіх хадэкаў былі складкі ксяндзоў-прыхільнікаў БХД. У лютым 1929 г. кс. Фабіян Абрантовіч, высылаючы кс. Ад. Станкевічу чэк на 100 даляраў, пісаў: “...стараюся, каб прыслаць Табе і Вінцуку [Гадлеўскаму. – аўт.] доларавых інтэнцыяў… Думаю, што зараз дастану і вышлю [1, арк. 10 адв]”. На працягу ўсіх 1930-х гг. па 20–30 даляраў прысылаў кс. Ад. Станкевічу ксёндз Янка Тарасевіч – манах манастыра св. Пракопа ў штаце Ілінойс ЗША. Такіх фактаў у архіўных дакументах налічваецца вельмі многа. Паводле гісторыка Ю. Туронка, дапамогу Беларускай хрысціянскай дэмакратыі аказвала да пяцідзесяці каталіцкіх ксяндзоў, якія часта афіцыйна не супрацоўнічалі з БХД, аднак спачувалі ёй [10, с. LXXVIII]. Кс. Ад. Станкевічу і кс. В. Гадлеўскаму ўдалося арганізаваць сярод беларускіх ксяндзоў нешта накшталт касы ўзаемадапамогі. Дзесяткі ксяндзоў, беларусаў па паходжанні, што жылі ў Польшчы, ЗША, Кітаі, Італіі лічылі сваім абавязкам фінансава падтрымліваць БХД, ведаючы, што сродкі, перададзеныя Станкевічу і Гадлеўскаму, будуць патрачаны па прызначэнні.

На жаль, падобная фінансавая "падпітка" з боку свецкага беларускага грамадства была вельмі слабай, у першую чаргу з-за нязначнасці нацыянальна свядомага сярэдняга класа на вёсцы і поўнай адсутнасці беларускай нацыянальнай буржуазіі ў горадзе. Да гэтага дадавалася таксама і незаможнасць беларускай вёскі. Ахвяраванне значных сумаў на дзейнасць БІГіКа і БХД было хутчэй адзінкавае, чым заканамернае. Так, у 1933 г. адзін жыхар Мядзведзіцкай гміны Баранавіцкага павета ахвяраваў БІГіКу 100 даляраў, гэтыя грошы сталі асновай для пабудовы ў 1936 г. беларускага дома [11, с. 196].

Некалькі разоў беларускія хадэкі спрабавалі арганізаваць эканамічную дзейнасць, якая б прыносіла прыбыткі. Уласна і Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры стварыўся не толькі як культурна-асветніцкая, але і як гаспадарчая і эканамічная арганізацыя. У 1926–27 гг. працавалі кааператыўна-гандлёвыя курсы БІГіКа (іх наведвала больш 30 чалавек), на якіх выкладаліся асновы экономікі і кааперацыі, бухгалтэрыя, справаводства, беларускамоўная карэспандэнцыя і інш. Аднак стварыць сістэму прыбытковага беларускага прадпрымальніцтва хадэкам так і не ўдалося. Напрыклад, у 1927 г. старшыня БІГіКа Адам Більдзюкевіч набыў рэйсавы аўтобус і паспрабаваў адкрыць адзін з першых на Віленшчыне аўтобусных маршрутаў, але з-за вялікага кошту білетаў функцыянаванне маршрута было нерэнтабельным, а аўтобус хутка зламаўся.

Няшмат палепшыў эканамічнае становішча створаны восенню 1927 г. хадэцкім асяроддзем Беларускі кааператыўна-прамыслова-земляробскі банк. Функцыі апошняга звяліся да акумулявання грашовых сродкаў некаторых беларускіх кааператываў і прызначэння стыпендыяў і аднаразовых крэдытаў найбольш незаможным і здольным членам Беларускага студэнцкага саюза [6, спр. 6Б, арк. 78].

Збіраць грошы на беларускую справу сярод сваіх парафіянаў – не членаў БІГіКа ці БХД – беларускія ксяндзы, як правіла, не рашаліся, паколькі гэта выклікала імгненную жорсткую рэакцыю з боку касцельных і свецкіх уладаў. Арганізаваць падобную акцыю кс. Ад. Станкевіч прапанаваў толькі аднойчы, летам 1929 г., калі беларуская друкарня імя Ф. Скарыны магла быць зачынена з-за даўгоў [11, с. 177–178].

Паколькі пасля 1926 г. віленская біскупская курыя не аказвала ніякай дапамогі хадэкам, беларускія ксяндзы нярэдка звярталіся да высокапастаўленых каталіцкіх святароў непалякаў. Яшчэ ў 1921 г. кс. Ад. Станкевіч звяртаўся па дапамогу да чэхаславацкага біскупа сенатара А. Стаяна, у 1934 г. італьянскага біскупа Мармагі наведаў кс. Язэп Рэшаць [1, арк. 3]. І калі ў першым выпадку ў дапамозе беларускім хадэкам было адмоўлена, то ў другім удалося дасягнуць пэўнага поспеху. Мармагі, уражаны добрым веданнем кс. Я. Рэшацем італьянскай мовы, абяцаў фінансаваць выданне некаторых рэлігійных кнігаў на беларускай мове, аднак прызнаў, што мае звязаныя рукі, паколькі фактычна павінен пагаджацца з пазіцыяй польскага епіскапату адносна справы беларусізацыі каталіцкага касцёла [1, арк. 14]. Найбольш шчыльнымі былі кантакты кс. Ад. Станкевіча з біскупам Гданьска Эдвардам О'Руркам, які стаяў на прынцыповых пазіцыях абароны інтарэсаў беларусаў перад Рымам, паколькі сам паходзіў з Навагрудчыны і некаторы час займаў высокую пасаду ў каталіцкай іерархіі ў Мінску. У сярэдзіне 1920-х гг. кс. Ад. Станкевіч наведваў О'Рурка ў Гданьску, але сказаць больш дакладна аб выніках іх сустрэч пакуль нельга [9, Sygn. I.303.4.2696]. Нельга таксама абмінуць справу ўзаемаадносін лідэраў БХД з украінскім грэка-каталіцкім мітрапалітам Шаптыцкім. Шаптыцкі актыўна дапамагаў беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху і быў знаёмы з кс. У. Талочкам і кс. В. Гадлеўскім яшчэ з 1917 г. У пачатку 1920-х гг. кс. Ад. Станкевіч прывёз ад Шаптыцкага 1 000 амерыканскіх даляраў, якія былі ахвяраваны апошнім на пабудову дома для беларускага музея імя І. Луцкевіча [2, 1933, № 21, с. 1].

Завяршаючы агляд крыніц фінансавання БХД, нельга пакінуць па-за ўвагай яшчэ адзін важны сюжэт. Паводле шматлікіх сведчанняў, кс. Ад. Станкевіч ніколі не цураўся фінансавых паступленняў ад радыкальных беларускіх арганізацый, асабліва калі гэта тычылася друку і не наносіла ідэалагічнай шкоды самім хадэкам. Гэта зразумела, паколькі і Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ), і пасольскі клуб "Змаганне", і Камуністычная партыя Заходняй Беларусі пастаянна падтрымліваліся велізарнымі валютнымі сумамі з СССР, а БХД ніякай значнай знешняй фінансавай падтрымкі не мела. У канцы 1926 г. друкарня імя Ф. Скарыны надрукавала другое выданне праграмы БСРГ, летам 1929 г. кс. Ад. Станкевіч па дамоўленасці з І. Дварчаніным выдаў у друкарні радыкальную газету "Сьвет" [11, с. 178]. У другой палове 1930-х гг. КПЗБ падтрымлівала выданне часопіса "Калоссе", а ў друкарні імя Ф. Скарыны са згоды яе ўласніка кс. Станкевіча працавалі нелегальныя наборшчыкі-члены КПЗБ. Неабходна таксама звярнуць увагу на тое, што, будучы выключаным амаль з усіх арганізацыяў, якія былі пад уплывам Грамады, Адам Станкевіч да самага канца заставаўся членам праўлення адной з самых важных грамадоўскіх інстытуцыяў – Беларускага кааператыўнага банка і нават штомесяц атрымліваў 200 злотых (кошт тыражу прыкладна аднаго нумара "Беларускай Крыніцы") [9, Sygn. I.303.4.2696].

**Заключэнне**

Праведзены аналіз літаратуры і крыніц, у якіх асвятляюцца разнастайныя аспекты фінансавання Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, дазволіў нам выдзеліць асноўныя крыніцы фінансавання БХД.

1. Найбольш важнай крыніцай фінансавання БХД былі грашовыя паступленні ад актывістаў партыі, у першую чаргу каталіцкіх ксяндзоў і паслоў польскага Сейма ад БХД. Ксяндзы-беларусы, як правіла, афіцыйна не з'яўляліся членамі БХД, аднак актыўна дапамагалі яе працы грашыма. Асабліва значнай была фінансавая падтрымка з боку Марыянскага манастыра ў Друі.

2. Удалай у фінансавым сэнсе трэба прызнаць выдавецкую дзейнасць беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, найперш стварэнне імі друкарні імя Ф. Скарыны. Выдавецкая дзейнасць не прыносіла вялікіх прыбыткаў, аднак была ў цэлым самаакупальнай і дазволіла беларускім хрысціянскім дэмакратам актыўна прапагандаваць беларускае друкаванае слова на вёсцы.

3. Прынамсі, на пачатковым этапе дзейнасці БХД (першая палова 1920-х гг.) партыя атрымлівала грашовую падтрымку з боку беларускіх арганізацый, што дзейнічалі на тэрыторыі Літвы і фінансаваліся літоўскім урадам.

4. На працягу ўсіх 1920–30 гг. БХД атрымлівала грашовыя паступленні з боку беларускіх радыкальных арганізацый (БСРГ, Беларускі пасольскі клуб "Змаганнне", КПЗБ), якія фінансаваліся з БССР.

5. Спарадычную падтрымку беларускім хрысціянскім дэмакратам аказвалі замежныя каталіцкія іерархі, зацікаўленыя ў развіцці і ўмацаванні барацьбы беларусаў за беларусізацыю каталіцкага касцёла і праваслаўнай царквы.

Такім чынам, усе вышэйпералічаныя факты можна звесці да адной агульнай высновы, што ў фінансавых адносінах Беларуская хрысціянская дэмакратыя забяспечвалася галоўным чынам за кошт сваіх членаў і сімпатыкаў (спачуваўшых БХД ксяндзоў, паслоў-членаў БПК), а таксама ўласнай, напрыклад выдавецкай, дзейнасці. Грашовыя паступленні ні ад Літвы, ні ад БССР, таксама як і ад каталіцкіх іерархаў і палітычных арганізацый іншых нацменшасцей, рашуча не ўплывалі на фінансавае становішча партыі. Грашовай падтрымкі з боку польскай адміністрацыі ў адмежак часу 1921–1939 гг. БХД не атрымлівала ніколі. Усё гэта, з аднаго боку, давала БХД

магчымасць найбольш паслядоўна трымацца курса, накіраванага на дасягненне незалежнасці Беларусі, з другога боку, беручы пад увагу беднасць тагачаснага беларускага грамадства і нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, не дазваляла беларускім хрысціянскім дэмакратам засяродзіць у сваіх руках значныя фінансавыя сродкі для вядзення больш шырокай і эфектыўнай палітычнай работы ў масах.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Аддзел рукапісаў бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Фонд 4. – Воп. 1. – Спр. 138. Лісты да кс. Ад. Станкевіча.
2. Беларуская Крыніца. 1925–1936.
3. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 279. Перапіска кс. Ад. Станкевіча па асабістых і службовых пытаннях.
4. Коўкель, І. І. Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя і яе роля ў беларускім грамадска-палітычным руху / І. І. Коўкель // Этносоциальные конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе. – Гродно, 2001. – Ч. 2. – С. 38–43.
5. Кузнецова, В. Белорусская христианская демократия / В. Кузнецова // Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / под ред. С. Скульского. – Минск : Изд-во Белорусской академии наук, 1935. – С. 271–290.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 880. – Воп. 1. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры.
7. Ластоўскі, В. Пратаколы допытаў / В. Ластоўскі // Маладосць. – 1993. – № 9. – С. 234–236; № 8. – С. 230–240.
8. Туронак, Юры. Да гісторыі Друйскага Марыянскага манастыра / Юры Туронак // Мадэрная гісторыя Беларусі. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2006. – С. 394–400.
9. Centralne Archiwum Wojskowe w Warszwie. Oddział II Sztabu Generalnego.
10. Garbiński, J. Bałoruski ruch chrześcijański XX wieku : słownik biograficzno-bibliograficzny / J. Garbiński, J. Turonek. – Warzsawa, 2003. – 987 s.
11. Moroz, M. Krynica : Ideołoqia i przywódcy białoruskieqo katolicyzmu / M. Moroz. – Białystok, 2001. – 230 s.

***Vashkievich A.F.* Belarusian Christian Democracy (1921–1939): the resources of financing of the party work**

In the article special attention is paid to the resources of financing of one of the most influential Belarusian political party in the period between two World wars – Belarusian Christian Democracy. The author comes to conclusion, that the base of budget of BChD was consisted of incomes from members and supporters of the party (Belarusian priests, representatives of Polish parliament – Sejm). The financial support of Lithuania and catholic hierarchs from abroad Poland was played very important role too.